В русской поэзии до XIX века господствовала точная рифма: *морозы — розы, народ — хоровод* и т. д. В. Маяковский ввел в практику неточную рифму, построенную на приблизительном созвучии концов строк, сделал ее более свободной: *овеян — кофеен, нужно — жемчужиной.* После его нововведений в словарь рифм пришло огромное количество слов, не востребованных в этом качестве ранее. Поэт провел оригинальнейшие эксперименты в области рифмовки:

От этого Терека
в поэтах
истерика.
Я Терек не видел.
Большая потерийка [2, с. 128].

Кроме конечной рифмы *истерика — потерийка* имеется еще и внутренняя рифма: *этого — поэтах, Терека — истерика.* В статье «Как делать стихи» он писал, что рифмовать можно не только концы строк, но и их начал, как можно рифмовать конец одной строки с началом следующей или одновременно концы первой и второй строк с последними словами третьей и четвертой.

В рэпе ценится нестандартная рифма и индивидуальный стиль, и это сближает тексты хип-хоп и поэзию футуризма. Футуристы, в том числе и В. Маяковский, предпочли оригинальность и новизну, отказавшись признавать какие-либо правила: от стихотворных размеров до орфографии. Например, составные рифмы — это тоже изобретение футуристов. Прием многократно повторенной рифмы — в литературе именуемый ассонансом (созвучие), а в рэпе известный как ломаный слог — излюбленный прием В. Маяковского. Иногда стихотворение строится на одном только созвучии, или же ассонанс сочетается с точной рифмой, как, например, у рэпера Лигалайза в трэке "Back together": «Молоды, но уже ветераны, старики, / Монстры музыки, остры на языки / Полны отваги» [4].

Для сравнения процитируем несколько строк из стихотворения В. Маяковского: «Любовь любому рожденному дадена, — / но между служб, / доходов / и прочего / со дня на день / очерствевает сердечная почва» [2, с. 334].

**Заключение.** Владимир Маяковский стал реформатором отечественного стихосложения. И хотя его раннее творчество отдает дань уважения традиционной форме, дальнейшие опыты поэта ведут его своей уникальной дорогой. Для В. Маяковского характерна установка на разговорную речь, обращение к слушателю, что и определило особенности ритмики его произведений. Расшатывание классического метра, предпринятое поэтом, востребовано сегодня в рэп-поэзии. Достижения Владимира Маяковского в области рифмы, ритмики и строфики поэтических текстов с успехом используются в творчестве представителей современной ритмической поэзии. Можно сделать вывод о том, что современные российские рэперы используют в своем творчестве приемы, разработанные русскими поэтами-авангардистами.

### Список цитируемых источников


1. *Гаспаров, М. Л.* Русские стихи 1890-х—1925-го годов в комментариях / М. Л. Гаспаров. — М. : Высш. шк., 1993.
2. *Маяковский, В. В.* Сочинения : в 2 т. / В. В. Маяковский. — М. : Правда, 1987.
3. *Маяковский, В. В.* Стихотворения. Поэмы. Пьесы / В. В. Маяковский. — Л. : Художест. лит., 1983.
4. Рэп-текст. РФ. Тексты песен рэп-исполнителей [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://рэп-текст.рф/ . — Дата доступа: 20.10.2018.
5. Сайт Миши Маваши [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://mavashimisha.ru/ . — Дата доступа: 20.10.2018.


УДК 82

**Н. С. Зубрыцкая**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 20 г. Баранавічы», Баранавічы*

## ВОБРАЗ МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ПАЭТА-ЗЕМЛЯКА ЯНА ЧАЧОТА

**Уводзіны.** У кожнага чалавека ёсць родны кут, дзе ён нарадзіўся і адкуль пачаў свой жыццёвы шлях. З любові да бацькоўскага дома, да роднай вёскі ці горада пачынаецца і выспявае пачуццё любові і да нашай вялікай радзімы — Беларусі. Тут, на роднай зямлі, закладваецца духоўны свет чалавека, асновы маралі, адбываецца станаўленне актыўнай грамадзянскай і творчай пазіцыі.

Гістарычны лёс беларускага народа і яго культуры ў другой палове XVIII і пачатку XIX стагоддзя развіваўся ў вельмі цяжкіх умовах. Абставіны былі неспрыяльныя, але беларускае мастацкае пісьменства выжыла, захавала сябе, бо сваімі каранямі было моцна звязана з народнай глебай, заставалася арганічнай часткай духоўнай культуры народа. Адбываецца пачатковы перыяд станаўлення новай беларускай літаратуры, пачынальнікам якога з'яўляецца Ян Чачот.

© Зубрыцкая Н. С., 2020

**Асноўная частка.** Уся творчасць Яна Чачота — гэта сапраўдны гімн Беларусі, роднай «Літве». Шукаючы матэрыялы для сваіх паэтычных твораў, ён звярнуўся па сюжэты і вобразы да вусна-паэтычнай творчасці свайго народа. Галоўным героем яго твораў з’яўляецца мужык, якога паэт просіць і павучае, ушчувае і выхоўвае. Аўтар гаворыць пра невыносна цяжкае становішча сялянскіх сем’яў, але прычыну гэтага бачыць у няздольнасці мужыка кіраваць сваёй гаспадаркай, у яго п’янстве і ляноце: Толькі, мусіць, той сынок // Не піў, як мы, водкі [1, с. 57]; Ой, гаруйма, братцы, мы, // Кіньма горку жлопель [1, с. 58]; Доля, шчасце зачне жыць, // Дзе цвяроза хата [1, с. 58].

У вершах аўтар выказвае меркаванні аб паляпшэнні сялянскай долі і хоць, безумоўна, не вырашае гэтай праблемы, паказвае як адну з прычын, чаму сялянін не змагаецца за паляпшэнне свайго становішча, а выбірае лёгкі шлях разбэшчанага жыцця.

Шырока і канкрэтна адлюстроўваецца ў чачотаўскіх баладах і мясцовая «геаграфія». Паэтыка баладнага жанру скіроўвае нас у свет фантазіі, вымыслу, містыкі, дзе ўсё павінна быць пазначана «нязвычным, звышнатуральным, абвостраным, метафарычным» [2, с. 26].

Усе балады Яна Чачота заснаваны на легендах і паданнях, якія ён чуў з вуснаў прыгоннага селяніна ў Рэпіхаве, у Новай Мышы, Наваградку. Кожная балада апавядае нам пра паходжанне назвы вёскі, возера, пра шляхецкія роды, пра злога пана, пра жыццё і быт селяніна, адначасова пісьменнік звяртаецца да праблем, якія існуюць у грамадстве, і спрабуе іх вырашыць пры дапамозе пяра.

Галоўны герой балады «Калдычэўскі шчупак» Міхал Верашчака — адзін з уладальнікаў Туганавічаў і Плужынаў, брат Марылі, каханай Адама Міцкевіча. У сваім творы Ян Чачот звяртаецца да сябра і заклікае яго пакінуць нікчэмны лад жыцця. Раскрыць вобраз Міхала, які марнуе час, дапамагаюць эпітэты: *цудоўнае* сэрца, *дарэмны* хлеб, *малады* свет душы, *няшчасны* гуляка; метафары: *пусціў* пяро ў лёт, ты ўвесь з галавой *патанеш* і інш. Паэт асуджае свайго сучасніка і сябра, просіць перагледзець свае адносіны да жыцця, узяцца за розум і паслужыць Айчыне. Прыкладам адданага служэння Айчыне ў баладзе з’яўляюцца два роды — Анцутаў і Верашчакаў. Шматлікія сродкі мастацкай выразнасці і разнастайныя тропы дапамагаюць Яну Чачоту перадаць прыгажосць ваколіц малой радзімы, працавітасць, сціпласць, адданае служэнне Айчыне ліцвінаў. У баладзе звароткі: О мой куме, гуляка, натхнёны, суседзі, найветлы, любы Міхале, брат — сведчаць аб тым, што пісьменнік добра ведаў беларускі фальклор і быт мясцовых сялян. Метафары і ўвасабленні дапамагаюць пісьменніку перадаць прыгажосць ваколіц Калдычэва, быт і жыццё ліцвінаў: Калдычэва, што зноў на абшары // Блакіт разліло сярод лета [1, с. 94]; Сталы проста гнуліся ў час той [1, с. 100]; Дзень прачынаўся // Адшумелі хрысціны // Рассыпалі кампліменты, кольне // Досціп мо неасцярожны // Дачка ўжо ў Анцуты — красуня, якая // Уся расцвіла на прыволлі [1, с. 100]. Эпітэты перадаюць сілу і спрыт старога Верашчакі: *моцны* дух у старога, *узнёслы* Верашчака, сіла ў руках *маладая*; радасць ад з’яўлення на свет дачкі ў Анцутаў: *незвычайныя* хрысціны, як пазбаўленне сям’і ад боскай кары; прыгажосць і маральную чысціню дзяўчыны: *сціплая*, *упатлівая*; прыгажосць возера: *светлая* Свіцязь. Параўнанні, якія сустракаюцца ў баладзе, дапамагаюць аўтару данесці не толькі Міхалу Верашчаку, але і нам, сучаснікам, як патрэбна жыць і працаваць, наладжваць сямейны быт: Ён так баляваў там, нібы вы сягоння // У Туганавічах — ну, няйначай! // А быў, як Міхал, і рыбак ён вядомы // Там любы яму ловы гэтыя сталі — // *Як шабля*, *як мёд*, *як кабеты* [1, с. 97]; Зноў сеюць і косяць, як быць і павінна // Няхай жа адно аднаго так кахаюць, // *Як мы во*, бацькі іх, зычліва [1, с. 104].

Другая балада Яна Чачота «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах» прысвечана тэме Радзімы. Дзве страфы твора раскрываюць клопат і хваляванне аўтара аб заняпадзе і страце роднай мовы: Пра ўсё гаварыце адкрыта і смела — // На тое ж нам дадзена мова [1, с. 106]. І хоць балада напісана на польскай мове, адчуваецца боль паэта за страчаную мову ліцвінаў, і ён імкнецца адрадзіць яе. Аўтар у сваім творы спрабуе раскрыць духоўны воблік царкоўных асоб. Паказвае, як пападдзя адступае ад пэўных маральных прынцыпаў, як імкнецца да «перлаў і сапфіраў» [1, с. 107]. Ян Чачот не шкадуе метафар, каб раскрыць вобраз аферысткі: Папа ўсё ўшчувае // Ёй грошай давай — да паболей. // І днямі й начамі *грызе* яго, *лае* [1, с. 107]; Жыць ёй трэба ў раскошы, // Каб самі плылі ў панчохах ёй грошы [1, с. 108]; Старая хоць брыдкая тварам, // Калі прыбярэцца, сябе яна ў мроі // Анёлам *малюе*, пачвара [1, с. 110]. Для таго, каб дасягнуць мэты, яна выкарыстала набожную фігурку, хоць бацюшка спачатку і не дае згоды: Поп гэты праект адхіляў вельмі шчыра // З кніг боскіх чытаў ёй цытаты, // Што люд, аніколі ашукваць не трэба. // Што д’яблава гэта прынада [1, с. 108]. З цягам часу імкненне да матэрыяльных каштоўнасцей бярэ верх над сумленнем і спагадлівасцю папа: Бярэ і бярэ поп дарункі людскія, // Забыўшы пра сорам грабе ў дзве рукі іх [1, с. 110]. Сваім творам Ян Чачот асуджае тагачаснае духавенства, паказвае, што хрысціянства — гэта рэлігія гуманная, таму божыя слугі заслужылі пакарання за свае ўчынкі, за здзек і ашуканства простага люду. Другім цэнтральным вобразам балады з’яўляецца ашуканы вясковы народ, які слепа верыць у «цудадзейнасць боскіх слёз і злотых мяхі насыпае» [1, с. 108]. У баладзе пісьменнік паказвае сацыяльна-бытавыя праблемы Беларусі пачатку XIX стагоддзя.

Падзеі, апісаныя ў баладзе «Мышанка», адбываюцца ў ваколіцах сённяшняй вёскі Новая Мыш і ракі Мышанка. Гэтыя мясціны былі вельмі блізкія і дарагія сэрцу паэту. Тут прайшло яго маленства: О мілы ўспамін! Дарагая Мышанка [1, с. 130]. У цэнтры твора — вобраз сялянскай дзяўчыны, якая не растраціла маральнай чысціні і прыгажосці, вернасці сабе і народу: Аднойчы ён стрэў пад ляшчынай густою // Красы найдзівоснай дзяўчыну [1, с. 126]. Эпітэтам «красы *найдзівоснай*» аўтар перадае прыгажосць ліцвінкі.

Адначасова ўводзіць і вобраз рыцара: Прыгожы і стронкі, вясёлы заўсёды, // Блукаў на кані ён па краі [1, с. 126]. Эпітэт *стронкі* перадае пагардлівасць рыцара да людзей. Гэта праяўляецца і ў яго дзеяннях да прастачкі, ён спрабуе яе ашукаць, але яна не паддаецца: Ёй страх, злосць і сорам патройваюць сілы, // Змагаецца быццам бы львіца [1, с. 129]. Увасабленне і параўнанне малююць нам вобраз дзяўчыны з непадкупным сумленнем. Для гордай і свабодалюбівай ліцвінкі самае святое — дзявочы гонар, чалавечая годнасць. І калі вырашаецца яе лёс, яна не можа здрадзіць сабе і вырашае лепш загінуць, чым аддацца ў рукі гвалтаўніку. Народ высока ацаніў учынак дзяўчыны і яе імем назваў раку. У яе вобразе аўтар увасобіў найлепшыя рысы яго сучасніцы: гордасць, непадкупнасць, маральную чысціню, незалежнасць — паказаў імкненне простага люду да духоўнасці.

З першых радкоў балады «Узногі» паўстае вобраз жорсткага пана: Як чорта, яго, пана ўзногскага, кожны // Здалёку абходзіў — быў гэтакі строгі [4, с. 132]. Параўнанне пана з чортам надае яго вобразу пачварнасці. Пагардлівасць у адносінах да людзей, лютасць адчуваюцца ў наступнай страфе: Хай знае галота! // Лупіць, каб запомніў — загад быў суровы [1, с. 134]. Пан — бязлітасны прыгнятальнік, увасабленне сіл тыраніі, жорсткасці, бесчалавечнасці. Вобраз пана аўтар раскрывае з дапамогай сродкаў мастацкай выразнасці: А пан — дзе ёсць прагнасць такая яшчэ ў свеце — // І ў горы сірочым карысць сабе ўгледзеў [1, с. 136]; Запомняць хай добра, не любіць пан смешак, // Усіх пакарае, хто вінен! [1, с. 132]. Эпітэы і ўвасабленні перадаюць жахлівую панараму жыцця сялянства пачатку XIX стагоддзя: У цёмнай хаціне, дзе ў місе крупіна, крупы не дагоніць, // А скваркі малой хоць, няма ў паміне! // Адная крапіва, ды тая без солі. // За нешта купіць яшчэ соль гэту трэба [1, с. 133]. Галотнае жыццё прымушае селяніна красці панскі лес. Толькі мужык так і не можа зразумець, чаму лес панскі: Ах, пане! Ці ж ты сеяў ягады тыя, // Ці ж гэта, скнара, набытак? // Засеяў сам бы скрозь гароды лясныя // Нам бедным, бяздольным, на ўжытак! // Пан жорстка карае злодзеяў, // І вось прывязалі ўжо да плота, // Хвасталі бічамі — за тыя ўсё дровы [1, с. 134]. Аўтар малюе пана і маральна разбэшчаным чалавекам: У двор прыцягнуў. І вось // Дзяўчына не вытрымала здзеку, // Памерла ад голаду, сораму, болю, // Адпомсціць за ўсё даручаючы Богу [1, с. 135]. Пісьменнік спачувае дзяўчыне: Лепш бы няхай у зямлю яе сырую, // Чым даць памагатым таго ненажорца // Зняважыць тваю сарамлівасць святую, // Цнатлівасць дзявочага сэрца [1, с. 136]. Ліцвінка становіцца ахвярай дзікунскай фізічнай расправы пана з тымі, хто ішоў супраць яго волі. Зламаў пан яе і маральна. Таму фізічная смерць для дзяўчыны — гэта выратаванне ад «сораму, голаду і болю». Абаронцам сялян ад жорсткасці пана выступае лес: А лес той пануры, цёмны, як хмары, // З нябёсамі тут ён гамоніць спрадвеку [1, с. 137]. Праз эпітэты, метафары і параўнанні Ян Чачот малюе лес як сведку жыцця народа і абаронцу: Ды з яснага неба над самым гаем // Раптоўна пярун тут ударыў, // Зірнуць не паспелі — агонь скрозь шугае, // Агонь аж *раве*, дым над дрэвамі *хмарай* [4, с. 138]. Панская сям'я, лічыць Ян Чачот, справядліва пакарана за здзекі над простым людам.

**Заключэнне.** У сваіх баладах Ян Чачот паспрабаваў раскрыць духоўны свет беларусаў, імкнуўся прапусціць яго праз прызму свайго ўспрымання. Балады, напісаныя на польскай мове, апавядаюць нам пра падзеі, якія адбываліся ў ваколіцах сённяшніх Баранавіч, Ляхавіч. Праблемы духоўнага сталення, маральнага выбару, закранутыя ў баладах, актуальныя і ў наш час. Духоўны свет лірычнага героя раскрываецца праз звычаі, быт, традыцыі беларуска-польскай шляхты і прыгонных сялян, праз іх жарты, гумар, паўсядзённыя справы і клопаты. Балады Чачота малююць беларускі народ шчырым, непасрэдным, часта супярэчлівым і не зусім паслядоўным, што абумоўліваецца гістарычнымі ўмовамі.

Падмуркам духоўнасці Яна Чачота і яго сучаснікаў пачатку XIX стагоддзя была праца, маральная чысціня, чалавечая годнасць, патрыятызм, любоў да малой радзімы.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Чачот, Я.* Выбранае : вершы, песні, балады / Я. Чачот ; уклад., пер. польскамоўн. тв., прадм. і камент. К. Цвіркі. — Мінск : Маст. літ. 2007. — 191 с.
2. Хто мы, адкуль мы... : гіст. эсэ, нарысы / аўт.-склад. А. Марціновіч. — Мінск : Беларусь, 2007. — 384 с.

УДК: 821.161.3-1

**П. Р. Пракурат**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## БАЛАДЫ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА

**Уводзіны.** Ян Баршчэўскі — беларускі польскамоўны пісьменнік-рамантык, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя. У сваёй творчасці (у прозе, вершах і баладах) здзейсніў удалую спробу сакралізацыі Беларусі.

© Пракурат П. Р., 2020